# ВЕСНІК

Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай

1999 2

Получив необходимый объем знаний по построению автоматических систем, учащиеся приступают к выполнению конкретной творческой задачи, решение которой должно находиться под контролем учителя. Одно из условий успешного решения задачи учащимися – это достаточная и доходчивая информация об объекте их интереса.

Усвоение нового материала об объекте во многом зависит от того, как школьник понимает принцип его функционирования.

В процессе понимания происходит включение новой информации в систему уже имеющихся у учащихся знаний [2]. Для характеристики учебного материала психологи строят (и рекомендуют это делать учителям) "лестницу обобщения" материала: вначале выделяют основные, т.е. "матричные", элементы (это определения, теоретические рассуждения, закономерности, законы в словесной и математической форме). Они служат "ступеньками" "лестницы обобщения". Их число определяет длину "лестницы". В качестве побочных элементов выступают разные средства наглядности: рисунки, графики, словесные пояснения, схемы, математические расчеты, а также ранее усвоенные абстрактные знания, число побочных элементов определяет "ширину" ступеньки. Например, для нашего урока "Термосопротивление" матричными будут такие элементы: рассуждения о полупроводниковых приборах и типах термосопротивлений, о температурной зависимости, основные характеристики изучаемых объектов и формулы. Побочные элементы: графики, схемы, чертежи, материал термисторов, применение их на производстве и в быту.

Изучив этот материал, учащиеся должны усвоить основные характеристики термосопротивлений и их применение в технике.

На основании вышесказанного можно с уверенностью сказать, что процесс формирования функциональной грамотности у школьников во многом зависит от правильного выбора объектов школьного прикладного материала, в которых должен обязательно присутствовать элемент творчества, необходимый для создания материальных объектов с признаками полезности и новизны, что, несомненно, найдет свое отражение в дальнейшей преобразующей деятельности учащихся.

*Литература*


1. Басаргин В.П. Лабораторная работа профориентационной направленности //Физика в школе. – 1995. – №6. – С. 45 –47.
2. Вайзер Г.А. Некоторые результаты психологических исследований на материале физики //Физика в школе. – 1991. – №2. – С. 75 –80.
3. Глазунов А.Т. Техника в курсе физики средней школы. – М.: Просвещение, 1977.– 160 с.
4. Демонстрационный эксперимент по физике в средней школе. Ч.1 /Под ред. А.А.Покровского. – М.: Просвещение, 1978. – 351 с.
5. Дидактика технологического образования: Кн. для учителя. Ч.1/ Под ред. П.Р.Атутова. – М.: ИОСО РАО, 1997. – 203 с.
6. Техническое творчество учащихся /Под ред. Ю.С.Столярова, Д.М.Комского. – М.: Просвещение, 1989. – 223 с.



***Summary***

*In the article it is stated that the functional literacy formation process of schoolchildren depends mostly on the right choice of activity objects.*


УДК 37. 01: 39

*В.С. Болбас*

# ПРЫРОДАЗГОДНАСЦЬ ВЫХАВАННЯ Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ БЕЛАРУСАЎ

Традыцыйная педагагічная культура беларусаў, як і іншых народаў, вякамі назапашвала вопыт выхавання падрастаючых пакаленняў, які непасрэдна выводзіўся з рэальнага жыцця. А жыццё нашых продкаў арганічна было звязана з навакольнай прыродай, таму прыродны ўплыў на развіццё грамадства заўсёды быў даволі істотным. Многія даследчыкі адносяць

прыродна-геаграфічныя дэтэрмінанты да ліку вызначальных у фарміраванні этнапсіхалагічных і сацыяльна-культурных адметнасцей людскіх супольнасцей. Так, напрыклад, згодна тэорыі народазнаўства Л.М. Гумілёва, «у розных кліматычных умовах геаграфічнага асяродзя утвараюцца розныя этнасы і розныя культурныя традыцыі»[3, с. 29].

Цесная злучанасць беларускага народа з своеасаблівым прыродным асяроддзем прадвызначала шмат адметнасцей і ў арганізацыі выхавання дзяцей. Непарыўную злітнасць беларусаў з прыродай адлюстроўвала язычніцтва, якое нават пасля распаўсюджання хрысціянства працягвала мірна суіснаваць з апошнім. Самым непасрэдным чынам язычніцтва садзейнічала ўмацаванню сувязей чалавека з прыродай. А маральна-выхаваўчы ўхіл хрысціянскай рэлігіі ў спалучэнні з асаблівасцямі славянскага ўкладу жыцця ў сваю чаргу адпаведным чынам вызначаў многія грамадскія працэсы, якія арганічна будаваліся на натуральных, прыродных пачатках.

Так, народна-выхаваўчыя мэты беларусаў, як і асноўныя пастулаты хрысціянскай этыкі, прадугледжвалі фарміраванне абшчынна скіраванага чалавека з высокім узроўнем духоўнасці, крытэрыем якой было агульнае дабро. У мінулыя часы да 90% усіх тэрыторый сучаснай Беларусі займалі лясы і балоты. Гэта вымушала нашых продкаў аб'ядноўваць свае намаганні ў распрацоўцы пасяўных плошчаў, у пераадоленні разнастайных цяжкасцей і перашкод. Не выпадкова народная мудрасць выпрацавала досыць катэгарычныя заключэнні: «Хто жыве ўкупе, не баліць у пупе», «У гурце нішто не страшна», «Адна галавешка ў пячы не гарыць, а дзве і ў полі не тухнуць», «Моцны статак чарадою, а людзі грамадою»[5, с. 368-375]. Таму абшчынны лад жыцця накладваў адбітак і на працэс гадавання дзяцей.

Прыродна-геаграфічны фактар аказаў моцнае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнага характару беларусаў, што непасрэдным чынам вызначала змест выхавання падрастаючых пакаленняў. На думку даследчыкаў, раўнінны і нізінны рэльеф Беларусі паўплываў на складванне спакойнага, разважлівага характару беларусаў. У значнай меры, дзякуючы прыродным асаблівасцям краю, змест выхавання этнічнай педагогікі беларусаў уключаў выпрацоўку такіх якасцей, як стрыманасць, вынослівасць, памяркоўнасць, гуманнасць і іншыя. Больш таго, адрозненні ў прыродных умовах паўночных і паўднёвых раёнаў Беларусі садзейнічалі фарміраванню некалькі адрозных характараў у іх жыхароў. Насельнікі паўночна-усходніх зямель, дзе пераважае ўзгоркавы рэльеф, больш энергічныя, рашучыя, а тыя, хто жыве на Палессі, менш актыўныя, больш меланхалічныя. Э.С.Дубянецкі адзначае, што жыццё сярод лясоў, балот абумовілі жыццястойкасць, вынослівасць, цягавітасць беларусаў [4, с. 30-31]. Усё гэта адпаведным чынам знайшло выражэнне ў мэтах і змесце выхавання. Маральны ідэал народнай педагогікі беларусаў уяўляе сабой сапраўднага чалавека, адданага роднаму краю, арганічна злучанага з «мілым кутком». Прыгажосць прыроды, мэтазгоднасць і гарманічнасць яе з'яў напаўняла выхаваўчы ідэал дабрынёй, гуманізмам, своеасаблівым лірызмам душы. Сапраўдныя беларусы цвёрда перакананы, што «Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюць» і што «Лепей у сваіх людзях з голаду паміраць, чым у чужых людзях золата збіраць» [2, с. 58-59].

Цесная злучанасць жыцця беларусаў з прыродным асяроддзем прывяла да вылучэння ў народнай педагогіцы прыродазгоднасці выхавання ў якасці найважнейшага прынцыпу.

Прычым прытрымліванне гэтага прынцыпу ў традыцыйнай педагогічнай культуры даволі шматаспектнае і больш шырокае, чым у навуковай педагогіцы. Існавала перакананне аб дасканаласці, разумнасці прыроды, у тым ліку і прыроды чалавека, меркавалася, што ў ёй больш дабра, чым зла, і дабро пры правільнай арганізацыі жыцця перамагае. Гэты прынцып, па сутнасці, патрабаваў арганічнай сувязі, злітнасці чалавечага існавання з жывой і нежывой прыродай, якая ў сваю чаргу выступала ў якасці важнейшай выхаваўчай школы. Выхаванец пастаянна адчуваў сябе часцінкай космасу, уплыў якога на індывіда адэкватна вызначаецца не толькі канкрэтнымі ўчынкамі, паводзінамі, але нават думкамі і намерамі чалавека.

У народзе было прыкмечана, што на развіццё асобы істотны ўплыў аказвае фактар спадчыннасці. На эмпірычным узроўні народная педагагічная мудрасць спрабавала даказаць, што многія рысы і якасці перадаюцца ад бацькоў дзецям з пакалення ў пакаленне. Фальклорная скарбонка беларусаў утрымлівае шэраг выслоўяў, якія пераконвалі ў прадвызначаннасці спадчыннасцю чалавечых асаблівасцей («Не адкоціцца яблык ад яблыні»[2, с. 125], «Сава не народзіць сокала», «Які куст, такія і адросткі», «Якая матка, такое і дзіцятка», «Якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын»[2, с. 141], «Дзеўка маткаю красна»[2, 118], «Які дуб, такія і плады», «Ад добрага караня - добры і адростак», «Як добрае семя, то добрае племя», «Харошых бацькоў - харошыя і дзеці»[6, с. 126] і іншыя. Не улічваць такія высновы ў выхаванні было проста немагчыма. Але ж выхаваўчы вопыт таксама папя-

рэджваў, што падобныя залежнасці паміж бацькамі і дзецьмі ўсё-такі не з'яўляюцца фатальна вызначальнымі. У кожным правіле існуюць выключэнні, таму здараецца, што і ў «Аднога бацькі і адной маткі няроўныя бываюць дзіцяткі»[2, с. 112], «І ў сям'і не без вырадка»[1, 88 ], «Нягоднік не родзіцца, а зробіцца»[2, с. 128]. Дарэчы, такім чынам народная педагогіка досыць вычарпальна адказвае на пытанне, якое з'яўляецца прадметам даўніх спрэчак вучоных. Гэта пытанне аб тым, ці аднолькавыя ўсе людзі ад нараджэння ў якасці аб'ектаў маральнага выхавання?

Прытрымліваннне прынцыпу прыродазгоднасці асабліва выразна праяўляецца пры арганізацыі выхавання ў адпаведансці з прыродай дзіцяці. Маецца на ўвазе полаўзроставая стратыфікацыя выхаванцаў і ўлік іх індывідуальных асаблівасцей. Згадаем, што з самага нараджэння прынцыпова па рознаму арганізуецца гадаванне хлапчукоў і дзяўчынак. Такія адметнасці відавочны не толькі ў агульнавыхаваўчых мэтах, калі першых рыхтавалі да вядучай ролі мужа, руплівага і дбайнага гаспадара, другіх - да ролі паслухмянай, працавітай жонкі, а і ў маральна-выхаваўчых. Так, у мужчын высока цаніліся маральныя каштоўнасці, якія грунтаваліся на сіле волі, фізічнай сіле, лоўкасці, умельстве. Таму на першы план вылучаліся такія якасці, як цвёрдасць характару, адпаведнасць слоў і спраў, прыстойнасць, сумленнасць, пачуццё ўласнага гонару, цярплівасць і інш. З ранняга дзяцінства фарміравалася перакананне, што «Гаспадар - галава ў хаце»[2, с. 199]. Больш высокае становішча ў іерархічнай лесвіцы маральных якасцей жанчыны займалі дабрыня, сціпласць, стрыманасць, цнатлівасць, паслухмянасць. Адрозненні ў гадаванні хлапчукоў і дзяўчынак у народнай педагогіцы настолькі істотныя, што, па сутнасці, выхаванне дзяцей раздзялялася на два асобныя працэсы - працэс выхавання хлапчукоў і працэс выхавання дзяўчынак. Кожны з іх меў свае мэты, свой змест, існавалі адрозненні ў выхаваўчых метадах і сродках, а таксама ў адпаведных патрабаваннях да іх арганізацыі.

Гэтак жа сама патрабавала народная педагогіка мяняць выхаваўчыя падыходы ў залежнасці ад узросту дзіцяці. Вельмі яскрава сведчыць аб гэтым наступная прымаўка: «Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, да сямі пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка»[2, 116]. Прычым лічылі, што «кожны ўзрост сваім шчасцем жыве». За аснову ўзроставага падыходу ў выхаванні народная педагогіка бярэ храналагічны ўзрост усіх дзяцей, і гэта дапамагае вызначыць і вылучыць на першы план спецыфіку выхавання не асобнага індывіда, а пэўнай катэгорыі выхаванцаў. Як адзначаюць даследчыкі, народна-выхаваўчая практыка вылучала наступныя ўзроставыя перыяды: 0-1 год - немаўлятка, 1-3 - маленства, 3-7 - ранняе дзяцінства, 7-12 - дзяцінства, 12-14 - падлеткавы ўзрост, 14 - 17-18 - юнацтва. У народзе дакладна сфарміравана ідэя, што выхаванне дзяцей павінна пачынацца як мага раней: «Гні галінку пакуль маладзенька» [2, с. 116], «Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць»[6, с. 133], «Што ў маленстве выхаваеш, на тое ў старасці і абапярэшся», «Не навучыш слухаць маленькім, не паслухае, калі барада вырасце» і інш.

Народная педагагічная мудрасць звяртае таксама ўвагу і на тое, што побач з агульнымі адметнасцямі дзяцей пэўнага ўзросту існуюць індывідуальныя асаблівасці, якія не заўсёды ўпісваюцца ў звыклыя жыццёвыя ўяўленні. «Не роўны лес, не роўныя людзі», «Кожны чалавек па-свойму жыве»[1, с. 199], - разважліва заключалі ў народзе. Так, напрыклад, часта ў фальклорных творах апавядаецца аб той ці іншай асобе зусім не падобнай на іншых людзей, якая праяўляла свае асаблівыя здольнасці толькі пры пэўных, індывідуальных адносінах да яе. Вельмі часта ў пачатку народных казак усе сыны падаюцца разумнымі, а адзін - дурань. Але ў далейшым высвятляецца, што ён проста не такі, як усе іншыя, а, як правіла, з'яўляецца носьбітам высокіх маральных якасцей, схаваных пад незвычайнасцю індывіда, і потым у сілу пэўных абставін становіцца сапраўдным героем. Апроч усяго іншага, засяроджвалася ўвага выхавальнікаў на глыбокім, удумлівым унікненні ва ўнутраную сутнасць з'яў, бо «Не ўсё тое золата, што блішчыць»[2, с. 177]. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што ў адрозненне ад акадэмічнай педагогікі традыцыная педагогіка вызначала метады і сродкі выхавання, не толькі і не столькі зыходзячы з выхаваўчых мэт і зместу, колькі ў значнай ступені, а падчас і ў асноўным арыентуючыся на здольнасці і магчымасці канкрэтных дзяцей. У гэтым і праяўляецца яе жыццёсцвярджальная сіла, і адсюль бярэ пачатак адна з найважнейшых умоў яе эфектыўнасці.

У любога народа, і беларусы тут не выключэнне, значная частка вусна-паэтычнай творчасці грунтуецца на каляндарна-абрадавай дзейнасці, якая адлюстроўвае прыродныя з'явы, поры года і г.д. У беларускім фальклоры цяжка знайсці твор, які прама ці ўскосна не раскрываў бы сувязі чалавека з прыродай. Усведамленне арганічнай злучаннасці з прыро-

дай, успрыняцце чалавека ў якасці яе састаўной часцінкі, садзейнічала правядзенню прамых аналогій паміж асобнымі прыроднымі працэсамі і выхаваннем дзяцей. Сфармуляваныя падобным чынам патрабаванні да практычнай арганізацыі выхавання хоць і знаходзяцца, з пункту гледжання сучаснай навукі, на прымітыўным, эмпірычным узроўні і могуць быць памылковымі, але ўсіх жыхароў ад малога да старога яны даходліва, зразумела і пераканаўча ўзбройвалі відавочнымі «педагагічнымі ведамі»: «Гукні на лес, то і лес адгукнецца», «Гэта яшчэ цвет, а ягады будуць»[2, с. 247], «Па кветках яблыкаў не лічы»[2, с. 255], «І сабака добры дух чуе», «Не ўсякая мука хлебам стане», «Лішняга і свіння не есць», «Адзін дуб у полі - то не лес»[5, с. 373].

У рэальным жыцці беларусаў сама прырода была цудоўным выхаваўчым сродкам. Не без падстаў яе адносяць да «гаючых лекаў» душы і цела. А фарміраванне адпаведных адносін чалавека да жывой і нежывой прыроды ўяўляла сабой важнейшы кампанент маральнага выхавання. У народных уяўленнях маральна дасканалы чалавек «і галінку не зломіць, і травінку не вырве». Сапраўдныя чалавечыя якасці якраз і праяўляюцца праз адносіны індывіда да звяроў і птушак. Не выпадкова беларусы лічаць: «Дзе знішчаецца прырода, там знішчаецца жыццё», «Хто заб'е бабра - не будзе мець дабра»[2, с. 102 ], ці «Што мне золата, свяціла б сонца».

Навукоўцы, якія займаюцца вывучэннем народна-педагагічнай культуры, аднадушны ў тым, што выніковасць традыцыйнага выхавання ў значнай ступені абумоўлена яго цеснай сувяззю з жыццём. Як правіла, выхаванне там не адасабляецца ў спецыяльна арганізаваны працэс, яно арганічна ўплятаецца ў шматбаковыя грамадскія адносіны, дзеці не столькі рыхтаваліся да будучага дарослага жыцця, колькі паступова пераходзілі ў яго шляхам ускладнення сваёй сацыяльнай ролі. Ужо ў дзіцячых гульнях яны імітавалі жыццё дарослых, набывалі пэўныя ўменні, рысы і якасці, з ранняга дзяцінства ўключаліся ў прадукцыйную, грамадска-карысную працу. Народна-выхаваўчая сістэма, па сутнасці, цвёрда прытрымлівалася здавалася б відавочнай ісціны, якую, на жаль, не даацэньваюць і сучасныя прафесійныя педагогі, што ўзровень эфектыўнасці і шматбаковасці выхавання дзяцей і моладзі залежыць ад ўзроўню сапраўднай іх уключаннасці ва ўсе сферы дзейнасці ў канкрэтным прыродным і грамадскім асяроддзі. Працэс сацыялізацыі адбываўся самым натуральным чынам, без відавочных рыўкоў і скачкоў. І хаця ў станаўленні асобы спецыяльна арганізаванаму выхаванню не заўсёды адводзілася бясспрэчна першае месца, усё ж лічылася, што без яго немагчыма фарміраванне прыстойнага чалавека. («Не кручаны - не рэмень, не вучоны - не чалавек»[2, с. 148], «Чаго чалавек не зможа, таго і Бог не дапаможа» і інш.). Высокая ацэнка давалася настаўнікам-выхаванцам: «Калі б можна было без настаўніка, то бараны б чыталі кніжкі»[2, с. 147], «Шануй настаўніка лепей, як крамніка, болей, чым мельніка»[2, с. 257].

Народная педагогіка беларусаў выпрацавала і шэраг іншых патрабаванняў да арганізацыі выхавання дзяцей, якія рэгулявалі характар і структуру гэтага працэсу. З іх дапамогай эфектыўнасць народнага выхавання дасягала істотнага ўзроўню. Нездарма заможная шляхта аддавала сваіх дзяцей на выхаванне ў простыя сялянскія сем'і для набыцця грамадска-значных, агульначалавечых, маральных якасцей.

### *Літаратура*


1. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Склаў Я.Рапановіч. - Мн.: Дзярж. выд-ва БССР, 1958. - 380с.

2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразелагізмы / Склаў Ф.Янкоўскі. - 3-е выд., дапрац., дап. - Мн.: Навука і тэхніка, 1992. - 491с.

3. Гумилёв Л.Н. Конец и вновь начало / Сост. и общ. ред. А.М. Куркчи. - М.: Ин-т "Дидик", 1997. - 554 с.

4. Дубянецкі Э.С. Беларускі нацыянальны характар: Спроба даследавання //Адукацыя і выхаванне. - 1995. - №5. - С.29-39.

5. Прыказкі і прымаўкі: У 2 кн. Кн. 1 / Рэд. А.С.Фядосік. - Мн.: Навука і тэхніка, 1976. - 560с.

6. Прыказкі і прымаўкі. У 2 кн. Кн. 2 / Рэд. А.С.Фядосік. - Мн.: Навука і тэхніка, 1976. - 616с.



### *Summary*

*The special ideas of Belarusian folk pedagogics for the first time are generated in this work. They allow to state that the nature-correspondence of education is the most important principle of the public-educational system.*